Ключевые слова: МАК, soft skills, образовательный процесс, развитие креативности.

Метафорические карты (МАК) можно успешно использовать на занятиях по этике и эстетике, философии, социально-культурной антропологии и социологии. Метафоричность колод помогает использовать карты для решения многих педагогических задач. Особенно хорошо подходит использование МАК на практических занятиях у студентов художественно-графического факультета. Занятия-тренинги с использованием МАК помогают обучающимся развивать креативность, осознавать собственные барьеры, формирует навыки и умения управлять творческим процессом.

Ассоциативно-образная направленность МАК предполагает, что эффективнее всего использовать их на занятиях для тренировки обучающихся soft skills.

Soft skills – это надпрофессиональные навыки, которые помогают решать жизненные задачи и наладить хороший контакт с другими людьми. Это такие навыки как коммуникация, критическое мышление, умение решать сложные проблемы и принимать важные решения, работать в режиме неопределенности.

В начале занятия и при знакомстве с группой метафорические карты можно использовать для создания атмосферы доверия, настройки обучающихся на самоанализ, рефлексию, саморазвитие и поиск решений. Можно предложить участникам выбрать по карте из колоды и попросить их интерпретировать изображение с точки зрения внутренних мотивов обучения, желаемых результатов, возможных препятствий. Например, колоду Persona и другие портретные колоды можно использовать на занятиях по Этике и Эстетике. С помощью данных колод можно развивать у студентов креативность, ассоциативность, эмпатию. Преподаватель может предложить обучающимся выбрать и описать карты-портреты, а также ответить на вопросы, какими качествами, по их мнению, обладают данные личности, и какую роль названные качества играют в их жизни. В результате этого упражнения обучающиеся могут построить стратегию личностного развития. Упражнение окно ДжоГарри можно использовать на занятиях по философии для практики самопознания и формирования мировоззрения.

Метафорические карты могут быть полезны и в конце обучения. Участники могут вытащить по несколько карт и с их помощью описать своё состояние в начале и конце учебного курса: вспомнить свои цели, оценить достигнутые результаты. Это поможет педагогу получить обратную связь, а студентам отрефлексировать свой опыт и оценить полученные знания.

Таким образом, метафорические ассоциативные карты являются прекрасным инструментом для обучения студентов в рамках дисциплин гуманитарного цикла, и могут помочь обучающимся показать более высокие результаты при исполнении творческих и письменных работ.

Список использованных источников

1. Буравцова, Н. В. Использование метафорических карт с детьми и подростками / Н. В. Буравцова. – Новосибирск, 2017. – 200 с.
2. Грецов, А. Г. Тренинг креативности для старшеклассников и студентов / А. Г. Грецов. – СПб. : Питер, 2008. – 208 с.

УДК 811.161.3:81’34

# АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ВЫВУЧЭННЯ СПАЛУЧАЛЬНАСЦІ ЗЫЧНЫХ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

***Мандзік В. А., к.ф.н., ст. навук. супрацоўнік***

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разгледжана ступень рэалізацыі ў беларускіх фанетычных даследаваннях універсальных прынцыпаў, на якіх грунтуецца вывучэнне кансанантнай дыстрыбуцыі (спалучальнасці зычных). Паказана, што інвентар магчымых кансанантных груп, а таксама камбінаторныя абмежаванні патрабуюць удакладнення, звязанага з улікам ужывання ў мове кампазітаў і іншамоўных слоў.*

Ключавыя словы: беларуская мова, фанетыка, фаналогія, кансанантная сістэма, дыстрыбуцыя, спалучэнні зычных, правілы спалучальнасці.

Камбінаторныя ўласцівасці зычных (магчымасці іх спалучэння) маюць сваю спецыфіку ў кожнай мове. Асноўныя законы кансанантнай спалучальнасці апісаны і ў беларускай фанетыцы [1; 2; 3], аднак сучасны стан развіцця мовы (перш за ўсё, актыўнае папаўненне лексічнага запасу за кошт запазычванняў) прадастаўляе новы матэрыял для даследавання і ўдакладнення гэтых законаў.

Істотным з метадалагічнага пункту гледжання з'яўляецца вылучэнне прынцыпаў, паводле якіх належыць ажыццяўляць вывучэнне спалучальнасці зычных. Асноўныя ўніверсальныя падыходы, якія неабходна ўлічваць у такіх даследаваннях, сфармуляваны М. С. Трубяцкім [4, с. 265–269]. Разгледзім, якім чынам гэтыя прынцыпы рэалізуюцца пры вывучэнні кансанантнай дыстрыбуцыі ў беларускай літаратурнай мове.

1. Правілы спалучальнасці фанем прадугледжваюць наяўнасць больш высокай фаналагічнай адзінкі, у межах якой яны дзейнічаюць. У адносінах да беларускай мовы за такую адзінку прымаецца слова (для параўнання, у нямецкай – марфема); варта ўдакладніць, што гаворка ідзе менавіта пра фанетычнае слова. Напрыклад, у маўленні як цэласныя фанетычныя словы рэалізуюцца кампазіты, а таксама спалучэнні самастойных часцін мовы з праклітыкамі і энклітыкамі. Аналіз такіх кантэкстаў дае больш поўнае ўяўленне пра спалучальныя магчымасці зычных, пашырае іх. Неабходнасць уліку пры дыстрыбуцыйным аналізе менавіта фанетычных слоў прызнавалася айчыннымі лінгвістамі і раней, аднак не заўсёды гэты падыход прымяняўся. Так, апісваючы характэрныя для беларускай мовы пачатковыя двух- і трохгукавыя спалучэнні зычных, А. І. Падлужны заўважае, што «тут не ўлічаны кансанантныя спалучэнні, якія ўзнікаюць у тэксце ў сувязі з праклітыкамі, а яны часам з'яўляюцца даволі паказальнымі. Так, у беларускай мове бывае немагчыма непасрэднае спалучэнне прыназоўнікаў з, к, калі слова пачынаецца з пэўных зычных або спалучэнняў зычных, параўн.: ка мне, са мной, са спіны, к маме, з мамай, з сіропам і г. д.» [3, с. 47]. Відавочна, што, напрыклад, праклітычны прыназоўнік з можа значна пашыраць функцыянаванне пачатковага падоўжанага мяккага [з':] (з зімы – [з:'імы], з зялёным – [з:'ал'оным] і інш.), які ў пачатку слоў сустракаецца толькі ў адзінкавых выпадках (ззяць – [з:'ац'], ззелянець – [з:'эл'ан'эц']).

Ва ўжо згаданым даследаванні А. І. Падлужнага пры аналізе кансанантных груп у сярэдзіне слова не бяруцца пад увагу таксама спалучэнні, што ўзнікаюць на стыку частак складаных і складанаскарочаных слоў. Пры такім падыходзе лагічным выглядае сцвярджэнне, што гук [м] у сярэдзіне слова «можа спалучацца з любым іншым гукам, за выключэннем (м, м'), паколькі ў беларускай мове адсутнічаюць падоўжаныя (м, м')» [2, с. 90]. Між тым аналіз сандхіяльных стыкаў кампазітаў паказвае, што такія спалучэнні магчымыя (грам-малекула [ɣра̀м:ал'э́кула], тайм-менеджмент [та̀ймм'э́н'эжм'энт] // [та̀йм:э́нэжмэнт]). Заўважым, што ў далейшых даследаваннях адметнасць фанетычнай структуры складаных і складанаскарочаных слоў улічвалася. Так, Л. Ц. Выгонная пры апісанні спалучэнняў гукаў у межах слова прыводзіць некаторыя прыклады асіміляцыйных змяненняў па глухасці / звонкасці на мяжы састаўных частак кампазітаў: ту[пс]анаторый (тубсанаторый), шлю[бб]элька (шлюп-бэлька), ашча[тк]аса (ашчадкаса), спе[дзг]ароднінагандаль (спецгароднінагандаль) [1]. Фанетычная адаптацыя новых кампазітаў, безумоўна, значна пашырае магчымасці кансанантнай спалучальнасці ў межах фанетычных слоў. Так, могуць узнікаць падоўжаныя зычныя, неўласцівыя беларускай фанетычнай сістэме (картынг-хол – [ка̀ртынх:о́л]; функцыянаванне падоўжанага [х:]).

2. Пасля вызначэння фаналагічнай адзінкі павінны быць разгледжаны пазіцыі ўнутры яе (пачатковая, сярэдзінная, канцавая) і тры асноўныя формы спалучэння фанем (спалучэнне галосных паміж сабой, зычных паміж сабой і галосных з зычнымі). Гэты прынцып цалкам вытрыманы ў даследаванні Л. Ц. Выгоннай: функцыянаванне кожнага тыпу спалучэнняў (напрыклад, «мяккі зычны + націскны галосны», «шумны + санорны») разгледжана для пазіцый пачатку, сярэдзіны і канца слова. Пры вывучэнні камбінаторных уласцівасцей зычных неабходна ўстанавіць, якія з іх увогуле могуць спалучацца паміж сабой у дадзенай пазіцыі (і ў якой паслядоўнасці), а якія спалучэнні забароненыя. Асноўныя абмежаванні ў кансанантнай дыстрыбуцыі беларускай літаратурнай мовы былі сфармуляваны А. І. Падлужным [3]. Гэта немагчымасць спалучэння зычных [ɣ'], [z'], [к], [н'], [с'], [ц'], [р], [х], [ц], [ч], [ш] з [j] (акрамя запазычаных слоў тыпу Рэйк'явік, пасьянс, каньяк, дасье); адсутнасць спалучэнняў [нб], [мд], [цх]; рэдкае функцыянаванне груп са шчыліннымі зычнымі ў якасці

другога члена; забарона ўжывання выбухных [д], [т] перад афрыкатамі [ц], [ч], [ž] і некаторыя іншыя. Зразумела, што гэтыя назіранні патрабуюць удакладнення і пашырэння з улікам сучаснай маўленчай практыкі. Так, пры больш дэталёвым аналізе дыстрыбуцыі цвёрдай афрыкаты [ц] можна заўважыць, што ў двухкампанентных спалучэннях з папярэднімі выбухнымі дапускаецца спалучэнне толькі з цвёрдымі зычнымі: кансанантныя групы [б'ц], [п'ц], [к'ц], [g'ц] незалежна ад пазіцыі ў слове не ўжываюцца.

3. Правілы кансанантнай спалучальнасці па-рознаму рэалізуюцца пры фанетычнай адаптацыі запазычаных слоў. У беларускай мове іншамоўная лексіка пераважна адаптуецца такім чынам, што яе фанетычны воблік адпавядае звычайным, сфарміраваным у адносінах да спрадвечных слоў правілам спалучальнасці фанем. Аднак гэты працэс можа суправаджацца ўзнікненнем новых кансанантных груп. Так, паводле Л. Ц. Выгоннай, афрыката [z] у якасці другога члена выступае толькі ў адной двухкампанентнай групе [нz] (ксяндзоўскі – [кс'анzоўск'і]) і ў адной трохкампанентнай [нzл'] (пэндзлік – [пэнzл'ік]). Аднак у кітайскіх уласных назвах фіксуюцца яшчэ спалучэнні [н'z'] (Сіньцзян – [с'ін'z'ан]) і [нzз] (Янцзы – [йанzзы]).

Такім чынам, можна сцвярджаць, што даследаванне спалучальнасці зычных у беларускай літаратурнай мове адпавядае асноўным універсальным прынцыпам, на якіх грунтуецца вывучэнне кансанантнай дыстрыбуцыі ў фаналогіі. У той жа час інвентар магчымых кансанантных груп, а таксама дыстрыбуцыйныя абмежаванні патрабуюць удакладнення, звязанага з улікам ужывання ў мове кампазітаў і іншамоўных слоў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Выгонная, Л. Ц. Спалучэнні гукаў у межах слова / Л. Ц. Выгонная // Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.] ; рэд. А. І. Падлужны. – Мінск, 1989. – С. 142–235.
2. Падлужны, А. І. Дыстрыбуцыйныя класы фанем у беларускай мове / А. І. Падлужны // Выбраныя працы / А. І. Падлужны ; уклад.: В. П. Русак, В. І. Уласевіч, Т. Я. Шэмет. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – С. 87–97.
3. Падлужны, А. І. Некаторыя правілы спалучэння зычных гукаў у беларускай мове / А. І. Падлужны // Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы / А. І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – С. 47–54.
4. Трубецкой, Н. С. Основы фонологии / Н. С. Трубецкой ; пер. с нем. А. А. Холодовича ; под ред. С. Д. Кацнельсона. – Москва : Аспект Пресс, 2000. – 352 с.

УДК 316.334

# ОСОБЕННОСТИ СОЦИОЛОГИЧЕСКОГО ПОДХОДА К ПРАВОСОЗНАНИЮ

***Ромашова Л. О., к.соц.н., доц.***

*Московский гуманитарный университет,*
*г. Москва, Российская Федерация*

Реферат. *В статье рассматривается социологический подход к пониманию правосознания. Анализируется сущность и особенности индивидуального правосознания.*

Ключевые слова: правосознание, личность, общество, отношение, сознание, социологический подход.

Рассмотрение правосознания с позиции социологического взгляда позволяет понять его социальное содержание, структуру и формы проявления.

Правосознание имеет определенное социальное структурное образование, включающее правосознание индивида, различных социальных групп и правосознание общества в целом. Все эти образующие элементы находятся в определенной взаимосвязи и представляют некую единую целостность. Общественное, групповое и индивидуальное правосознание имеют единый предмет воспроизведения – отношение к действительности, взаимодействие с людьми, поведение, выстроенные в соответствии с существующими нормативами.

При этом, наличие единства не сводится только к элементарной суммарности. Между ними имеется различие по влиянию друг на друга, по наполнению, по осуществляющим